жр 3177

Библиотека АН БССР

Комуністычная партыя (большэвікоу) Беларусі

Смерць нямецким акупантам!

# За Совецкую Радзіму

№ 19
ЧАЦВЕР 23 снежня 1943 г.

Орган Уздзенскага РК КП(б)Б

**Партызаны і партызанкі! Працоуныя Уздзеншчыны! Сустракайце 25 гадавіну Совецкай Беларусі магутнымі ударамі па тылах гітлерауских ордау. Бязлітасна знішчайце подлых фашысцкіх ізвергау і паліцэйскіх іудау!**

## 25 ГАДАВІНУ БССР АДЗНАЧЫМ МАГУТНЫМІ УДАРАМІ ПА ВОРАГУ!

1 студзеня 1944 года спауняецца 25 год з дня утварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублики. Гэта дата для беларускага народа мае вялікае гістарычнае значэнне. 1 студзеня 1919 года беларускі народ ажыццявіу свае вялікае імкненне—аб'еднауся з рускім, украінскім и другімі брацкімі народамі у адзіную Совецкую Дзяржаву.

Арганізатарамі Беларускай ССР былі бальшэвіцкія партыя і яе правадыры Ленин и Сталин. Пад их кірауніцтвам, апіраючыся на брацкую падтрымку и дапамогу народау Совецкага Саюза, беларускі народ у годы грамадзянскай вайны адстаяу маладую Совецкую Рэспубліку ад нямецкіх, польскіх и другіх захопнікау. За годы Совецкай улады наш народ дабиуся буйнага росквіту прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры и дабрабыту працоуных.

Але немец-фашыст перарвау шчаслівае жыццё народа. Ужо два з палавінай гады лютуе нямецкі звер на нашай зямлі. Сотни тысяч забітых, замучаных и жывымі спаленых нашых людзей з'явіліся ахвярай гітлераускага „новага парадку". Нечуваным тэрорам нямецкія акупанты імкнуцца пакарыць беларускі народ. Але дарэмна! Народ-багатыр не стау на калені, смела узняу над галовамі фашыстау меч помсты, ад якога ужо звалилися многия тысячы нямецких бандыцких галоу. Лепшыя беларуския сыны у партызанских атрадах, не шкадуючы жыцця, змагаюцца за вызваленне роднай Беларуси ад нямецких захопникау.

25 гадавину БССР мы сустракаем у дни рашаючых битвау. Чырвоная Армия паспяхова изгание ворага з нашай беларускай зямли. Ад нямецких захватчыкау вызвалены многия раёны Беларуси, амаль поунасцю Гомельская вобласць з горадам Гомель. На днях нашы войски прав珈ли вельми умацаваную абаронную паласу працуника на поудзень ад Невеля. У выніку прарыва совецкия воины вырвали з фашысцких лап 690 населеных пунктау, сярод якіх райцэнтр Вицебскай области Езерышча. Час перамоги недалёка.

Працоуныя Уздзеншчыны! Нямецкия людаеды гатовы на любыя правакацыи для знишчэння совецких людзей.

Не верце фашыстам! Знишчайце нямецких крывавых сабак. Суровая помста фашысцким звяругам за усе их злачынствы! Кроу за кроу! Смерць за смерць!

Партызаны и партызанки! Азнаменуйце 25 гадавину БССР новымі магутнымі ударамі па тылах ворага! Усе силы на поуны разгром нямецких акупантау, на хутчэйшае выгнанне их з нашай Радзимы! За свабодную Совецкую Беларусь!

## У апошні час

За паспяхова праведзеную аперацыю па прарыву моцна ўмацаванай абароны немцау на поудзень ад горада Невель, злучэнні и часци Чырвонай Армии, якия адзначыліся у гэтай аперацыи, загадам Вярхоунага Галоунакамандуючага Маршала Совецкага Саюза тав. И. В. Сталина прадстаулены к урадавай узнагародзе.

## На Фронтах айчыннай вайны

На днях войски 1-га Прыбалтыйскага фронта пад камандаваннем генерала армии Баграмяна перайшли у наступленне супроць нямецка-фашысцких войск, размешчаных на поудзень ад Невеля, и прарвали вельми умацаваную абаронную паласу працуника на працягу па фронту каля 80 клм. и у глыбиню да 30 клм.

За 5 дзён напружаных баёу нашыми войсками вызвалена больш 500 населеных пунктау, сярод их райцэнтр Вицебскай области Езерышча и чыгуначныя станцыи Езерышча, Грыбаки, Бычыха.

У баях разгромлены 87, 129 и 211 пяхотныя дывизии, 20 танкавая дывизия и некальки ахоуных часцей немцау. Знишчана 69 танкау, 164 гарматы, 123 минамёты, 586 кулямётау, 760 аутамашын и 16 складау.

Працуник пакинуу на полі боя забитыми да 20000 салдат и афицэрау.

Нашыми войсками захоплены наступныя трафеи: 194 гарматы, 75 минамётау, 735 кулямётау, 5.000 винтовак и аутаматау, 37 танкау, 110 аутамашын, 24 склады з боепрыпасами, узбраеннем, снаражэннем и харчаваннем, 200 павозак з грузами и ваеннай маёмасцю. Узята у палон больш 2000 нямецких салдат и афицэрау.

На працягу 20, 21 и 22 снежня на поудзень ад Невеля нашы войски, працягваючы развиваць наступленне, занялі больш 190 населеных пунктау.

У раёне Корасценя, па поудневы усход ад Кiравaграда и на паудневы захад ад Жлобина нашы войски паспяхова адбивали контратаки буйных сил пяхоты и танкау працуника.

жр 3177



# БАЯВЫМІ СПРАВАМІ СУСТРАКАЕМ 25—ГОДДЗЕ БССР

## Баявое заданне выканана

Камандзір партызанскага атрада імя Катоускага дау баявое заданне камандзіру роты т. Крывега П.—вывесці са строю мельніцу у Закрэушчыне, дзе гітлерауцы малолі награбленае у сялян зерне. Мельніцу ахоувалі паліцэйскія бобікі з Узды.

Тав. Крывега правільна зрабіу расстаноуку партызан, у выніку чаго мельніца была акружана. Нямецкія халуі пры першай-жа сутычцы з партызанамі кінуліся цераз рэчку цаўцёкі у Узду. Народныя мсціуцы выканалі баявое заданне—мельніца была узарвана.

Асаблівую адвагу пры гэтым паказалі т. т. Бублік, К., Ш., Міронау.

Селедзя. З.

## Добры „пачастунак“

Недалёка ад дарогі Слуцк-Копыль знаходзілася у засадзе пяць совецкіх патрыётау. Цярушыу сняжок, усцілаючы белым пухам зямлю.

— Добра, што пайшоу снег,—гаварыу Жэзя Б. сваім таварышам. Сняжок яшчэ лепей замаскіруе нашу міну.

Праз некаторы час паказалася нямецкая аутамашына з паліцэйскімі. Яна імчалася прама на міну. К выбуху міны далучыуся дружны агонь партызан.

Добра пачаставалі народныя мсціуцы чорных „гасцей“: 13 бобікау былі сцёрты з твару нашай зямлі.

Калюжны.

## Партызаны далі клятву

І днём і ноччу будзем грамідь пагавую нямчуру. Не пагасне помста наша па куль не заб'ём апошняга фрыца на зямлі совецкай.

Партызаны нашага атрада у баю з фашысцкім гадзуём 14 снежня г.г. знішчылі 10 фрыцау. Партызан Васільеу забіу 2 фрыцау, партызаны Смірноу. Ф., Р. — па аднаму гітлерауцу кожны.

К дню 25-годдзя нашай любімай Совецкай Беларусі партызаны далі клятву павялічыць свае баявыя рахункі знішчаных чужынцау.

Васіль А.

Атрад імя Кутузава.

## Наш падарунак юбілею БССР

Бой разгарауся. Фрыцы, кінуушы аутамашыны на гравейцы, залеглі у прыдарожныя канавы и збянтэжана адстрэльваліся.

Дыверсанты на чале з Іванам К. и Глушчанкам пад прыкрыццём нашага кулямётнага агня кароткімі перабежкамі наблізіліся к машынам. Вось и машыны. Успыхнуу агонь. Момант... и вялікае полымя абхваціла 2 машыны, нагружаныя авіяцыйнымі стабілізатарамі.

—Гэта наш падарунак к 25 годдзю БССР,—заявілі дыверсанты.

Петр К.

## Вадакачка узляцела у паветра

Група партызан з атрада „Кутузава“ на чале з тав. Г. у ноч на 23 лістапада г. г. правіла на чыгуначную станцыю Гарадзей. Абышоушы вартавых, совецкія патрыёты падабраліся да чыгуначнай вадакачкі и заложылі пад яе міну. Праз некаторы час вадакачка узляцела у паветра.

Партызаны незаметна пакінулі станцыю. Прыбыушы у атрад, яны далажылі камандаванню аб выкананні баявога задання.

Павел З.

## Атака

З воклічамі: „Уперад за Совецкую Беларусь! За Сталіна!“—народныя мсціуцы кінуліся у атаку супроць ненавісных нямецкіх захопнікау, якія ехалі па гравейцы Слуцк-Мінск. Магутная партызанская лавіна змяла фашысцкіх „ваякау“. Ні адзін гітлерауски кат не змог уцячы ад караючай рукі народных мсціуцау.

Партызаны у выніку атакі падабралі на полі боя багатыя трафеі. Совецкія патрыёты з атрада імя Кутузава захвацілі станкавы кулямёт.

Т. Ю.

## Помста

14 снежня г. г. на гравейцы Мінск-Слуцк ішоу напружаны бой з гітлерауцамі. Не маглі уратавацць фашысцкую погань ні канавы, ні узгоркі—усюды насцігалі фрыцау партызанскія кулі и гранаты.

Партызаны падняліся у атаку. Хвалёныя нямецкія „ваякі“ кінуліся уцякаць. Совецкі патрыёт Іканау з атрада „Б. Хмельніцкага“ нагнау тупарылага немца и са славамі: „За нашых замучаных людзей“,—прасадзіу штыком нямецкага изверга. Такі лёс чакае усіх фашысцкіх людаедау.

И. Д.

## У баю

Бой пачауся. Кароткімі перабежкамі мы наблізіліся да гравейкі Слуцк-Мінск. За гравейкаю у канаве залёг нямецкі аутаматчык, які вёу інтэнсіуны агонь па леваму флангу.

Я рашыу знішчыць нямецкага гада. Імклівым рыуком перасякаю гравейку и трапна кідаю у бок фашыста гранату. Варожы аутамат змоук, немцу-ж гранатай знесла чэрап.

Я падабрау аутамат, з якога пачау пасылаць фрыцам свінцовыя „гасцінцы“.

Партызан Говарау.

РЭДКАЛЕГІЯ